УДК 677.024: 745.52: 476.1(476.2)

**Галіна НЯЧАЕВА**

# Сімволіка геаметрычнага арнаменту

## *ткацкіх традыцый паўднёвага ўсходу Беларусі*



*Браны ручнік з дыяганальнай кампазіцыяй. Мядзвежае. 1905 г. ВМСБТ. КП 1139.*

**Арнамент ручніка ўтрымлівае геаметрычныя знакі. Дзіўнае падабенства з артэфактамі выяўляюць мясцовыя фальклорныя тэксты і абрады, якія маюць прастораваю кампазіцыю і арнаментальны спосаб яе пабудовы. Пра старажытнасць паходжання ўзораў ручнікоў сведчыць удзел у іх кампазіцыях розных знакаў адзінага геаметрычнага чыну, які ўзыходзіць да сістэмы раннеземляробчых культавых сімвалаў. У аснове гэтай сістэмы ляжаць два галоўныя знакі: крыж (прамы і касы) як магчымы мужчынскі сімвал, і ромб як сімвал зямлі-жанчыны [13] а таксама раннеземляробчы культавы сімвал "ромб з кручкамі" [1, с. 11—22].**

**Ключавыя словы**: *раннеземляробчыя культавыя сімвалы, археалогія, этнаграфія, тканыя ручнікі, арнамент, паўднёвы ўсход Беларусі, архаічныя абрады*

*Ромбы-нівы і "касыя хрясты" на ручніку. Неглюбка.*



### *Ромб-ніва як сімвал рытуалаў*

Ён адпавядае чацвёртаму вобразу Б.Багаеўскага (гл. с. 62): боства пакрытага разорамі, узаранага поля. На малюнку паказаны жаночы сімвал — ромб. У яго ўпісаны касы крыж — мужчынскі знак (аралі сахой крыж-накрыж, як барануюць і сёння). У выніку атрымлівалася чатыры ячэйкі. У кожную з іх уносіўся невялікі крыж або кропка. Гэта знакі насення, а для крыжыкаў, старажытных знакаў агню, магчыма сема (адзінка значэння) агню жыцця, жывога агню.

Земляробчы працэс служыў узорам для іншых культурных кодаў. Перш за ўсё — у атаесамленні зямлі і жанчыны (захавалася ўяўленне аб Маці Сырой Зямлі). Таму па суме сем, альбо дзеяў самога рытуала — ромб-ніва — гэта знак-вынік і сімвал узарання поля і свяшчэннага шлюбу, ад касмалагічнага сэнсу да вобразаў сямейна-бытавых абрадаў.

У земляробчай традыцыі ромб — знак узворвання і пасеву. У тоеснасці зямлі-жанчыны-маці ромб-ніва — сімвал зачацця нівы-жанчыны, якая "панесла". Знак выяўляецца з эпохі бронзы, напрыклад, у бандарыхінскай культуры VIII—VII стст. да н. э., якая

ўдзельнічала ў культурным этнагенезе сучаснай Веткаўшчыны. Напрыклад, на гліняным гаршку гэтай культуры спалучаюцца два ромбы. Адзін з іх запоўнены касой штрыхоўкай, другі — класічны ромб-ніва. Спалучэнне геаметрычных знакаў і тэма коней характэрна і для сялянскага мастацтва рускай Поўначы.

Знак нівы — гэта не толькі вынік, але і парадак дзеянняў: ромб — цалінная зямля, касы крыж — узворванне, кропкі — насенне. У паслядоўным чытанні элементаў геаметрычнай фігуры адбываецца іх складанне ў сэнс-вынік.

Ромб-ніва — базавы сімвал для развіцця шэрагу вытворных фігур у браным ткацтве нашага рэгіёна. Адваротны бок (ніцы бок, той бок) тканіны выяўляе структуру знакаў больш выразна. Размеркаванне колеру ў геаметрычных знаках адкрывае архаіку самой тэхнікі бранага ткацтва. Калі ручнік пакласці на паверхню зямлі, атрымаем адзін з першых спосабаў стварэння ўмоў магічнага ўзаемадзеяння Ярусаў Сусвету, г. зн. абраду. Гэта своеасаблівы знакавы дыялог Верху і Нізу (гіпатэтычна, паміж намі, светам жывых, і продкамі, светам мёртвых). Ён ажыццяўляецца скрозь паверхню тканіны, якая рассцілаецца па зямлі (параўнайце абрадавае пакрыццё *платкамі* і абрусамі магіл сваякоў на Радаўніцу ў Неглюбцы). Гэткае ж стварэнне ўмоў дыялогу — сама архаіка тэхнікі — у момант выканання ўзору: чырвоная нітка нырае на той бок і вынырвае на гэты. Калі яна ўнізе ("у іх"), на нашым баку — прабел. Калі яна вяртаецца — мы атрымліваем чырвоны знак, вынік уздзеяння (шыцця, ткання, арання) на "некранутую" паверхню тканіны / зямлі / цнатлівай нявесты. Такое і вандраванне ў ніжні свет. Або мадэль гаспадарчай дзейнасці: дзеі самога плуга, сахі, сэнс узворвання.

Калі разгледзець знак нівы, можна ўбачыць, што ў найбольш архаічных варыянтах нашага ткацтва касы крыж — узворвання — паглыблены на той бок, на які насамрэч аруць. Туды ж "пасеяны" і кропкі — насенне. Усе дзейсныя фазы вынікаюць з адзінай логікі тканага тэксту-дыялогу і з'яўляюцца да нас у кодзе чырвонага. На тым баку ручнікоў гэта выразна чытаецца ў негатыве. Можна выказаць здагадку, што семантыка тэхналогіі захоўвае архаічны сэнс бранага ткацтва: мадэляванне дыялогу з продкамі і хтанічнымі боствамі Нізу [18]. Сама ж тканіна выступае ў ролі паверхні зямлі і дзеянняў на ёй.

У тканых тэкстах — ручніках — у паслядоўнасці геаметрычных постацяў знак ромба-нівы можа тлумачыцца паводле семантыкі каляндарнага абрадавага круга: як этап сяўбы і злучаных з ім абрадаў. Найстаражытныя выявы ўзворвання і сяўбы транспануюцца, да прыкладу, у шлюбны абрад:

*Закладайце быкі-неўкі ў ярмо,*
*Ды будзем да навіначку араці.*
*Ды калі ж будзе навіначка целенька,*
*То тады ж будзе яечанька смачненька…*

(Беларуская народная творчасць. Вяселле. Т. 6. № 656.)



*Два сімвалы зямлі.*
*Бандарыхінская культура. VIII ст. да н. э.*

## *Ромб з выступамі як сімвал нівы*

У адпаведнасці з класіфікацыяй Б.Багаеўскага (пункты 4 і 5), мэтазгодна ўставіць яшчэ адну фазавую выяву святасці зямлі адносна беларускіх традыцый нашага рэгіёна. Ёй адпавядае сярэдні знак паміж "пасяўным" ромбам-нівай (без выступаў) і "ўраджайным" раннеземляробчым культавым сімвалам — ромбам з кручкамі [1, с. 11]. Гэта ромб з выступамі, ромб з парасткамі (*ромб с городками, городчатый; репей* (рус.); *дубок* (літоўск.), *лапа, лапа кучарявая* (бел. Неглюбка)).

У архетыпе яны выяўляюцца боствам і рытуальным комплексам, якія пакуль што абазначым варыятыўна: вясновая выява "нівы, якая прарастае // выхад коласа "ў трубку" // выява "нівы квітнеючай". Тэрмін "у трубку" агранамічны. Ён абазначае найважнейшую фазу ў развіцці жыта: утварэнне коласа ўнутры "трубкі", звітай вакол яго ліста. (*Каб наша жыта ў трубы павілося.*) У абрадавым календары гэтаму этапу адпавядае Страла (Стряла). (*Пачыналі вадзіць Стрялу апасля другога дня Пасхі.*) Пасля адбываецца выхад коласа з "трубкі", красаванне



*Неглюбская жаночая сарочка з арнаментам лапы па рукаве і мядзведзяў на прыполе.*

і апладненне, завязь зерняў (абрадавае *Пахаванне Стралы*, на 40-ы дзень, на Ушэсце):

*Бог узляцеў на небяса — падняў хлеб за каласа!*

(В.Стаўбун, Веткаўскі раён.)

Тэма прарастання-цвіцення жыта актуальная і ў абрадзе Провадаў русалак.

Пасля выканання абраду дзецям забаранялі хадзіць у квітнеючае жыта. Пад час яго русалку вялі і спявалі:

*Прывялі русалку*
*У зілёнае поле,*
*Снімем з русалкі зялёнае голле.*
*Адпусцім русалку*
*Ў чыстае поле,*
*Штоб дашла русалка*
*Да самага бога,*
*Папрасіла ў бога*
*Жыта да пшаніцы…*

(В. Усоха-Буда, Добрушскі раён.)

У абодвух прыкладах моўных тэкстаў назіраецца касмалагічны характар: у складзе дзеянняў, удзельнікаў, персанажаў, у пазначэнні ярусаў сусвету.

Такім чынам, гэтым вясновым фазам жыцця жыта і адпаведным абрадам у зборы геаметрычных знакаў можа адпавядаць ромб з выступамі, *лапа* на базе ромба-нівы. Гэты ж знак назіраецца на неглюбскіх рытуальных абрусах. Іх выкарыстоўваюць у чырвоным куце, у каляндарных і сямейных абрадах. Такімі абрусамі засцілалі і магілы сваякоў-*родзічаў, роду* на Радаўніцу. (*Там маткін род, там і рушнікі яе… Там пасцелем.*) На абрусе супрацьстаяць адзін аднаму жаночыя, шлюбныя *лапы*-"нівы" на арнаментальнай паласе — і "неўзараныя, цалінныя" *лапкі*, сплеценыя на сетцы паміж дзвюх полак абруса. У тэхніцы размярэжвання ўзнаўляецца сама гісторыя ткацтва: яе архаічны этап — першапляценне. Паміж дзвюма полкамі тканіны абруса, на ўсю яго даўжыню, на каленках (*у каленцы*) рукамі нацягваецца новая мікрааснова (шырынёй 1,5 — 2 см). Папярочныя ніці ўплятаюцца рукамі, іголкай, у гэтую аснову, ствараючы чырвоныя і белыя знакі. Гэта найчасцей хтанічныя знакі: "неўзараныя" ромбы-*лапкі*, глухія ромбы-*глухоўкі*, крукаватыя касыя крыжы (*кучарявыя казлы*).



*Пры вывучэнні афінскіх земляробчых культаў па старажытных тэкстах расійскі філолаг, гісторык і археолаг Б.Л.Багаеўскі (1882—1942) у пачатку XX ст. вылучыў розныя вобразы святасці Зямлі: 1) Зямля наогул як смутнае, неаформленае паняцце; 2) Маці-зямля як маці ўсяго жывога; 3) зямля-глебавая — як бліжэйшы земляробу вобраз; 4) боства пакрытага разорамі ўзаранага поля; 5) боства саспелага хлебнага поля [4, с. 96 і далей]. Пазней археолагі атаясамілі некаторыя з вобразаў з геаметрычнымі знакамі [1, с. 11—22].*

Знакі цаліннай зямлі маглі, па нашай здагадцы, быць дзявочымі ініцыяцыйнымі знакамі. Такія, напрыклад, канцэнтрычныя, не разбітыя касым крыжам ромбы-*лапы кучаравыя* на 16 атожылкаў на рукаве неглюбскай кашулі. Яны супастаўленыя з "дзікімі, стыхійнымі, хтанічнымі", магчыма, дзіцячымі, 8-канцовымі *лапкамі* на зарукаўі гэтай жа кашулі. І тыя, і іншыя маюць тоеснаць унутранай пабудовы: гэта канцэнтрычныя ромбы, па рэканструкцыі — хтанічныя выявы. Аднак паміж сабою лапы кучарявыя і лапкі адрозніваюцца менавіта па колькасці выступаў-атожылкаў: 8 і 16. Назіранні за ўзроставымі абрадамі і іх рэшткамі ў сістэме забаронаў і дазволаў, у зменах адзення ў неглюбскай традыцыі дазваляюць выказаць здагадку, што і знакі ўдзельнічалі ў ініцыяцыйнай сістэме. Колькасць атожылкаў у ромбаў: 4, 8, 12, 16, 20 — знаходзіць адпаведнасць ва ўзросце дзяўчынак і абрадавых зменах іх паводзін і адзення. Таксама ў жаноцкіх найменнях: *дзеці, дзевачкі, дзеўкі, поўная дзеўка, малодкі, маладзіцы, старыя, бабы* [19, с. 107 — 110].

Захаванне адзінага чыну геаметрычнага арнаменту ў розных тканых прадметах неглюбскага кола вёсак, як і адзінства тэрміналогіі, з яго архаічнымі вытокамі ўяўляе ўнікальны матэрыял [15]. Ён дазваляе праводзіць семіятычныя даследаванні з аналізам абрадавых роляў гэтых прадметаў, зафіксаваных у традыцыі.

Разгледзім ромб з выступамі (у негл. тэрміналогіі *лапа*) на прыкладах ручнікоў іншых мясцовых традыцый: з Баршчоўкі Добрушскага, Бабовічаў Гомельскага і Дзямідаўкі Буда-Кашалёўскага раёна. Яны адрозніваюцца ад неглюбскіх ручнікоў, маюць кампазіцыі вертыкальнага альбо дыяганальнага тыпу. Аднак геаметрычны чын старажытных знакаў рэалізуецца ў іх сінтаксісе гэтак жа заканамерна. Разнастайнасць ромбаў і ромбаў з выступамі тут таксама стварае апазіцыю глухіх і структураваных фігур. У ромбах-нівах відаць выдзяленне пар гарызантальных ячэек, якія апазнаюцца традыцыяй як *вочкі*. Ці не можа ў фармальнай апазіцыі захоўвацца яе семантычны архетып? Мы назіраем накладанне двух кодаў: кода земляробчых знакаў — і сэнсарнага кода глухаты / слепаты // зроку.

*Лапы і "касыя хрясты кучярявыя" на неглюбскім ручніку.*



*Ручнікі з Баршчоўкі Добрушскага, Бабовічаў Гомельскага раёна. 1920—1930-я гг.*

Гэты білінгвізм ярка выяўлены ў формах і ў тэрміналогіі неглюбскага кола (напрыклад, ромбы *глухая сляпая // глухая з глазам*; *сляпы мядзведзь // зоркі мядзведзь, з вокам*) [12]. Ромбы і ў самой Неглюбцы маюць антрапаморфныя рысы, маюць *вочкі* і ўваходзяць у фармальную апазіцыю са стыхійнымі *сляпымі* і *глухімі* ромбамі-*глухоўкамі, глушкамі, глушачкамі*. Тэрміны-назвы ромбаў у традыцыях выключна жаночага роду.

Аднак у гэтых ручніках вертыкальнага тыпу апазіцыя слепаты // зроку становіцца выразнай і яскравай прыкметай. Яна мае сляды семантычнага паходжання. Тут два варыянты і саміх *лупатых* ромбаў. Адны — ромбы без "парасткаў", культурныя знакі ўзаранай, засеянай нівы (ці абрадавага пачатку сяўбы). Другія — ромбы з выступамі, знакі праростай нівы, яе раслінай сілы (абрады з вясновай нівай). Антрапаморфнасць фігур ромбаў у такой трактоўцы павялічваецца. Магчыма таму, што старыя знакі зямлі транспануюцца ў код чалавека, у абрад шлюбу-вяселля.

Нягледзячы на тое, што тэрміналогіі старажытнага тыпу арнаменту ў дадзеных "вертыкальных" традыцыях ужо не атрымалася зафіксаваць, само выразнае супрацьпастаўленне постацяў па прыкмеце слепаты // зроку ўваходзіць у кантэкст гэтых жа фармальных прыкмет, выяўленых у ткацтве рэгіёна. У т. л. і "размаўлялых" традыцый тыпу Неглюбкі. Тым не менш гэты кірунак уяўляецца перспектыўным у рэканструкцыі найстаражытнай семантыкі арнаменту ручнікоў, якія ўжываюцца ў абрадах вяселля. Земляробчыя знакі пры гэтым датычацца шлюбнага чыну.

Ручнік з Дзямідаўкі перадае і дадатковую абрадавую традыцыю — дзве кампазіцыі арнаменту рознага паходжання злучаюцца ў адну падвойную, выразна выяўленую. Яны ткуцца на адным канцы ручніка разам. Магчыма, такая дыялогавая структура вылілася ў адзіную форму ў выніку вясельнага звычаю. У першы дзень вяселля ручнікі нявесткі вешалі па-над свякрушынымі. На другі, калі нявеста аказвалася сумленная, убор покуці мянялі на нявесткіны ручнікі.

Вывучаючы тэрытарыяльнае размеркаванне ручнікоў вертыкальнага тыпу, мы выявілі іх прывязку да правых берагоў Сожа і Бесядзі. Вёскі, носьбіты гэтага архаічнага тыпу, збольшага заснаваныя ў XV—XVI стст. Відавочна, што ятроўка "прыйшла" з правага "вертыкальнага" берага Сожа, а паласатая кампазіцыя ніжняй часткі — архетып выбарных левабярэжных тканін. Абодва тыпы паасобку прысутнічаюць, напрыклад, у Добрушскім раёне, у міжрэччы Сожа і яго левых прытокаў: Іпуці, Уці. На здвоеным канцы дзямідаўскага ручніка знакі нівы і знакі цаліннай зямлі маюць фазу прарастання. Яны вырашаны па-свойму, але прысутнічаюць як старажытная апазіцыя ў абедзвюх крыніцах.

Нашы назіранні паказваюць, што ў традыцыях ромб усведамляецца як зямля і пры змене выяўленчай мовы ў ткацтве і вышыўцы-*шыве*. На месцы выступаў, якія, як мяркуецца, сімвалізуюць парасткі, узнікаюць каласы, галіны і да т. п. Адна з вітрын у "Тканай зале" Веткаўскага музея прысвечана менавіта гэтаму пытанню: аб "перакладзе" геаметрычных сімвалаў у сістэмы выяўленчых арнаментаў. Сярод лакальных традыцый падобным культурным перакладам была занята дуброўская традыцыя Добрушскага раёна да 1930-х гг., калі яна амаль згасла.

Варта адзначыць, што дубраўскі ручнік 1930-х гг., нягледзячы на яго "натуралістычныя" галінкі і кветкі, архаічны. Элементы ручніка пераўтвараюцца не паасобку, а ў ахоўнай сіметрычнай касмалагічнай схеме, з салярнымі знакамі, знакамі верхніх і ніжніх вод. Як у беларускай прымаўцы, тут *Стаіць зямля сярод свету*.

Трактоўка семантыкі вылучанага намі ў мясцовых традыцыях ромба з выступамі можа быць варыятыўная. Гэта звязана з абрадамі вясновага перыяду, зафіксаванымі ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне: Юр'е, Страла/Стряла, Русалка. Кожны з іх бярэ на сябе галоўную ролю ў вясновай абраднасці, выцясняючы іншыя, у сувязі з чым гэтыя дамінантныя абрады могуць быць сінанімічныя. Назіраючы ў нашай

мясцовасці за абрадам Стралы, можна сказаць, што ён суправаджае фазу росту нівы.

Утылітарна *Страла* — абрад выклікання дажджу. У абрадзе *Пахавання Стралы* колас "выходзіць у трубку". Вобразна такія парасткі жыта могуць асацыявацца і як "стрэлкі". Пасля *Пахавання Стралы* колас "выстрэльвае" са згорнутага сцябла, дзе хаваўся, але быў ужо сфарміраваны і гатовы да наступнага этапу жыцця. Гэта як бы новае нараджэнне злака — для цвіцення-красавання (*жыта красуе*), дзеля апылення і завязі зерняў. Народны тэрмін — "*У трубы павілося*" прыводзіць да адной архетыпічнай асацыяцыі. Звіванне, павіванне — дзеянне спавівання немаўля і нябожчыка. Так што тэма нараджэння коласа, тэма перараджэнняў жыта/чалавека, магчыма, дрэмле ў абрадавай рэчаіснасці — і ў арнаменце.

Семантыку складу геаметрычнага знака ромба з выступамі магчыма рэканструяваць як знак нівы прарастаючай. Неадрыўна ад таго — і як знак абрадаў, прысвечаных гэтаму этапу. Такім чынам, падоўжаныя бакі і выступы ромба тлумачацца намі як парасткі. Часам падобныя знакі ў мясцовых традыцыях маюць арыгінальныя выступы, якія асацыююцца са стралой.

На ручніку з Баштана знакі ромба-нівы і нівы прарастаючай — розныя па цэнтральным запаўненні. Ромбы без выступаў — чысты архаічны знак нівы, падзелены касым крыжам на чатыры ячэйкі. Дарэчы, такое захоўванне формы індаеўрапейскага сімвала пры змяненні вытворных ад яго назіраецца ў шэрагу традыцый.

Ромбы з выступамі чаргуюцца з класічнымі "нівамі" і ўяўляюць сабой шасціячэйкавае поле з белымі крыжыкамі ўсярэдзіне. Гэтае шасцічленавае дзяленне, тыпу шасціпялёсткавых разетак, шасціспічных колаў, семантычна напоўненае. У літаратуры дадзеныя фігуры асацыююцца з нябеснай сімволікай і навальнічнымі знакамі.



Ручнік з Дзямідаўкі
Буда-Кашалёўскага раёна, 1920-я гг.



Дубраўскі ручнік.
1930-я гг.

Вобраз грамаўніка захоўваецца ў моўнай традыцыі: *"Толічак, хадзі ўжо дамоў, бо Пярун забярэ!"* (В. Глыбочыца, Чачэрскі раён, пры надыходзячай навальніцы.)

Кампазіцыя арнаменту ручніка з Баштана мае "зачын" у верхняй адасобленай паласе. Гэта чаргаванне ромбікаў з 4 атожылкамі і маленькіх *лапак* з 8 атожылкамі. Знакі канцэнтрычныя, у нашай гіпотэзе дзявочыя, з магчымым ініцыяцыйным сэнсам. Але і ў земляробчым кодзе выкананне такіх знакаў у пачатку разгортвання кампазіцыі цалкам абгрунтаванае. Этап зямлі цаліннай, юнай вясны знаходзіцца літаральна "на краі поля", якое прадстаўляе асноўная плошча кампазіцыі.

Ва ўсіх знаках выразна абазначаны маленькія крыжыкі. У такіх звычайна бачаць "насенне". Архетыпічна простыя крыжыкі — знакі агню, магчыма, па аналагах і па нашых доследах, агню жыцця. Яны выступаюць як цэнтры ў дзявочых цалінных знаках — і як насенне, пасеянае ўглыб, "на той бок" тканіны — у жаночых "нівах".

На дадзены момант мы толькі падступіліся да таямніц арнаменту ручнікоў беларускіх традыцый. Звычайна ён уяўляецца як мова, якая мае дэкаратыўнае значэнне. Аднак праз традыцыйную культуру, праз структуру семантычных адносін можна зразумець нешта большае пра старажытныя сімвалы.


1. Амброз, А. К. Раннеземледельческий культовый символ ("ромб с крючками") / А. К. Амброз // Советская археология. — 1966. — № 3. — С. 11 — 22.

2. Арнаменты Падняпроўя. — Мінск : Беларуская навука, 2004. — 606 с.

3. Беларуская народная творчасць. Веснавыя песні. — Мінск : Навука і тэхніка, 1979. — № 45. — С. 100.

4. Богаевский, Б. Л. Земледельческая религия Афин. І. — Пгр. : Тип. М. А. Александрова, 1916. — 240 с.

5. Вечнае. Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна. — Гомель : УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны", 2003. — 320 с.

6. Дробушевский, А. И. Ромбы "целинные" и "засеянные". Геометрический чин знаков в археологических и этнографических памятниках / А. И. Дробушевский, Г. Г. Нечаева // Деснинские древности. Материалы межгосударственной научной конференции, посвященной памяти Ф. М. Заверняева. Вып. 5. Брянск : Издательство Клинцовской городской типографии. 2008. — С. 24—33.

7. Загадки русского народа: Сборник загадок, вопросов, притч и задач — М. : Современный писатель, 1995. — 400 с.

8. Иванов, В. В. Структурно-типологический подход к семантической интепретации произведений изобразительного искусства в диахроническом аспекте / В. В. Иванов, В. Н. Топоров // Труды по знаковым системам. VIII / Уч. Зап. ТГУ. Вып. 411. — Тарту : Ун-т, 1977. С. 103 — 120.

9. Лотман, Ю. М. О мифологическом коде сюжетных текстов / Ю. М. Лотман // Сборник статей по вторичным моделирующим системам. — Тарту : Ун-т, 1973. — 205 с.

10. Мифы народов мира. — М. : Издательство "Советская энциклопедия", 1980. Т. 1. — 672.

11. Нечаева, Г. Г. Симметрия пространства и времени в рушнике. Семантика формы рушника / Г. Г. Нечаева // Матэрыялы абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Ручнік як увасабленне традыцыйнай культуры беларусаў" (Віцебск, 29—31 кастрычніка 1996 г.). — Віцебск, 1998. С. 20 — 23.

12. Нечаева, Г. Г. *Сляпыя вядзьмедзі* и *зоркія веряб'і*: архаика в терминологии орнамента деревни Неглюбки / Г. Г. Нечаева // Славянская фразеология и паремиология. Национальное и интернациональное. Стабильное и изменчивое. К 70-летию со дня рождения профессора В. И. Коваля : сборник научных статей / редкол.: Е. В. Нечипорчик (отв. ред.) [и др.]. — Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2021. — С. 216 — 222.

13. Нечаева, Г. Г. Судьба одного знака. Археология Почепа и современная этнография / Г. Г. Нечаева // Сб. научных статей "Деснинские древности". Брянск : Издательство Клинцовской городской типографии. — 2006. — С. 362 — 372.

14. Нечаева, Г. Г. Тексты текстиля и мифологические мотивы / Г. Г. Нечаева // Славянская мифология и этнолингвистика : сборник научных статей / редкол. : В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.] ; М-во образования РБ, Гом. гос. ун-т Ф. Скорины. — Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. — С. 197—202.

15. Нячаева, Г. Р. Арнамент: прастора рэчы і мова традыцыі. Кашулі, галаўныя жаночыя "платкі" і абрусы / Г. Р. Нячаева // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2004. — С. 111—139.

16. Нячаева, Г. Р. Арнаментальны знак "ромб" і яго асацыятыўныя мясцовыя назвы / Г. Р. Нячаева // VIII Навуковыя чытанні, прысвечаныя С.Некрашэвічу. Зборнік навуковых артыкулаў у 2-х частках. Ч. 2. Гомель, 2007. — С. 229 — 234.

17. Нячаева, Г. Р. Арнаментальныя кампазіцыі канцоў ручнікоў як мадэлі культурнай прасторы / Г. Р. Нячаева // Ткацтва. Зборнік матэрыялаў па беларускаму народнаму ткацтву. — Мн., 1999.

18. Нячаева, Г. Р. Мярэжы, тэхналогія як магія / Г. Р. Нячаева // Мастацтва. — 2000. — № 4. — С. 46 — 49.

19. Смирнова, И. Ю. Возрастная дифференциация женской одежды Неглюбского строя / И. Ю. Смирнова // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. — Гомель, 2004. — С. 107 — 110.

*Паступіў у рэдакцыю 12.06.2023.*

*У сярэдзіне XVII ст. у Расіі была праведзена царкоўная рэформа з некаторым змяненнем абрадаў і тэкстаў богаслужбовых кніг, для таго каб зблізіць іх з тымі, што былі прынятыя ў грэчаскай царкве. У кнігі пры параўнанні з грэчаскімі выданнямі было ўнесена шмат дробных змен, найбольш прыкметнымі з якіх можна лічыць напісанне імя Хрыста "Иисус" замест "Исус", пропуск саюза "а" ў словах "Сімвала веры": "рожденна, а не сотворена" і інш. Сярод змен таксама было ўвядзенне "троеперстия", г. зн. хрышчэнне трыма складзенымі пальцамі замест двух, была зменена колькасць і характар паклонаў і многае іншае. Рэформа праводзілася патрыярхам Ніканам і царом Аляксеем Міхайлавічам у кароткія тэрміны і з пераследам яе праціўнікаў, якія не ўхвалілі "здраду" старажытнай рускай традыцыі.*

*У расколе, які з'явіўся ў выніку рэформы паміж яе прыхільнікамі і праціўнікамі, якіх пазней сталі называць старабрадцамі (стараверамі), знайшлі адлюстраванне і злучыліся многія супярэчлівыя з'явы жыцця Расіі ў XVII ст. Гэта былі і канфлікты паміж тымі, хто вітаў распаўсюджванне іншаземнай культуры і звычаяў, і тымі, хто змагаўся з імі, і тэндэнцыі да адмовы ад царкоўных зямельных уладанняў і ад пасрэдніцтва святароў паміж чалавекам і Богам, і незадаволенасць гараджан і сялян узмацненнем прыгону.*

*У далейшай гісторыі стараабрадніцтва яго кансерватыўныя і прагрэсіўныя рысы перапляталіся паміж сабой: абшчыны прыхільнікаў "старой веры" імкнуліся ізалявацца ад зносін з афіцыйным праваслаўем, адмаўляліся ад прыняцця ўсяго новага. Яны бачылі ў самадзяржаўі і царкоўнай уладзе "царства Антыхрыста" і лічылі богаўгодным супраціў ім, удзельнічаючы ў антыфеадальных народных рухах і даючы ім рэлігійнае абгрунтаванне.*

*Стараабраднікі захавалі ў сваім асяроддзі ў больш строгім выглядзе традыцыйныя нормы маралі, працы, сямейнага жыцця. Адмаўляючыся ад кніг, выдадзеных рэфармаванай царквой з сярэдзіны XVII ст., яны збіралі і захоўвалі для будучых пакаленняў бясцэнныя помнікі пісьменства і мастацтва XI—XVI стст., якія афіцыйная царква нярэдка лічыла раскольніцкімі і шкоднымі.*

*На Беларусь стараабраднікі пачалі перасяляцца ў 1650-я гг. з Памор'я і Ноўгарада. Найбуйнейшым іх пасяленнем на Беларусі была Ветка, заснаваная ў 1685 г.*

*Падрыхтавана паводле кнігі: Религии мира : пособие для учителя / Я. Н. Щапов [и др.] ; под ред. члена-корреспондента РАН Я. Н. Щапова. — М. : Просвещение, 1994. — С. 78—79.*